Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 16 (515). Вільня, Нядзеля 16 Красавіка 1933 г. Год IX (XVII)

Беларуская Крыніца

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел. КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

ХРЫСТОС УСКРОС!..

Увесь хрысьціянскі сьвет сьвяткуе сяньня дзень Ускрашэньня Хрыста. Па ўсім сьвеце гудуць сяньня званы радасьці, жыцьця, веры і надзеі. Дзень Ускрашэньня Хрыста гэта дзень вечнай Вясны душы людзкой. Дык ня дзіва, што дзень гэты сьвяткуе сапраўды ўвесь сьвет,дзень гэты сьвяткуецца усюды, дзе ёсьць хрысьціяне. Не падсілу спыніць сьвяткаваньня гэтага дня нават і там, дзе ўладу над народам трымаюць часова староньнікі валадарства цемры, нявольніцтва і дыктатуры над душой людзкой, як ў С.С.Р.Р., у Мэксыцы, у Гішпаніі. І там, хоць паднявольныя, але сьвяткуюць хрысьціяне сяньняшні дзень, дзень Ускрашэньня Хрыстовага. І наш народ беларускі, у меру магчымасьцяў сваіх, у залежнасьці ад тых абставінаў, у якіх ён на зямлі сваей знайшоўся, так-жа сяньня весяліцца, так-жа ўрачыста сьвяткуе дзень Ускрашэньня, дзень Вясны душы сваей і сваей будучыні. Слушна дзень гэты народ наш заве днём вялікім (Вялікдзень), днём сьветлым. Так яно ёсьць сапраўды.

Вось ад часу крыжовай сьмерці Хрыста і яго Ускрашэньня сёлета мінае 1900 гадоў, а здарэньні гэтыя і агулам уся справа Хрыстовая ўсьцяж жывая, сьвежая, жыцьцёдайная. На працягу гэтых бяз сотні дзьвёх тысяч гадоў хрысьціянства многа перажыло і перажывае сяньня цяжкіх, часта крывавых прасьледаў, аднак у цярпеньні ня гіне, а толькі ачышчаецца, паглыбляецца, выказвае чалавецтву новыя вартасьці і далей жыве, падтрымліваючы ў душы людзкой, у душы народнай вечную Вясну, вечнае жыцьцё, вечныя ідэалы: Праўды, Дабра, Красы.

*

Факт Ускрашэньня Хрыста — гэта факт характару надпрыроднага, факт перавышаючы сілы і правы прыроды. Але гэта мы толькі прывыклі так дзяліць жыцьцё. Сапраўды-ж падзелу такога няма; жыцьцё, хоць злоджанае з матэрыі і духа, ёсьць нечым гармонічным, стройным, цэлым. Гэту стройнасьць і гармонійнасьць жыцьця нарушае звычайна праступная воля чалавека. Справа толькі ў тым, як Тварэц абʼяўляе нам сваю сілу: ці праз прыроду і праз яе, Ім-жа ўстаноўленыя правы, ці гэтую прыроду і правы яе мінаючы, як гэта выяўляецца з фактам Ускрашэньня Хрыстовага. Знача, Ускрашэньне Хрыстова — гэта найвышэйшая праява жыцьця духа, праява найвышэйшай вечнай сілы Божай.

Калі няпоўнай аналёгіяй, то прынамсі свайго роду падабенствам да Ускрашэньня Хрыстовага ёсьць пэўныя факты ў прыродзе, у жыцьці фізычным, матэрыяльным. Сапраўды, як у сьвеце жыцьця чыста духовага Ускрашэньне Хрыстова — гэта Вясна, так у сьвеце прыроды, у сьвеце жыцьця фізычнага штогодняе прабуджэньне прыроды да жыцьця ёсьць вясной гэтай прыроды. Абедзьве-ж гэтыя вясны, як бачым, становяць нешта блізкае, падобнае.Нават і што да часу яны блізкія.

Хрыстос Ускрос! усклікаем радасна, а з Хрыстом ускрашае і ўся прырода, вырываецца з путаў сьмерці ды імкнецца да новага, лепшага жыцьця. Пад цёплым павевам вясны аджывае замерзлая зямля, вольна пачынае дыхаць і пакрываецца зялёнай травіцай, чароўнай краскай і плоднай збажынай, а павэтра напаўняецца радасным сьпевам і шчэбетам птушак. Словам, вясна прыходзіць. І так з году ў год. З гэтага бачым, што ў прыродзе, як і ў сьвеце духа, няма сьмерці. Ёсьць толькі часовы занепад, часовая сьпячка, перамена і аднаўленьне.

*

Сапраўды, дзіўная да ўсякага ўскрашэньня вядзе дарога! Дарога — барацьбы, цярпеньня і сьмерці. Такое ўжо права жыцьця: жыцьця фізычнага і жыцьця духовага, жыцьця як прыроднага, так і надпрыроднага.

Кожнае зерне, прад тым як абойдзе, мусіць у зямлі як-бы памерці, перамяніцца, „згніць." Ускрашэньне ягонае папераджае свайго роду сьмерць.

Усё жыцьцё нашай прыроды так-жа праходзіць праз нейкую сьмяротную сьпячку: праз восень і зіму. У гэтым часе ўсё ў прыродзе сохне, чэзьне, ледзянее, заміраe. Але не назаўсёды. Прыбліжаецца да зямелькі ў свaім часе жыцьцедайнае сонца, асьвеціць яе, абагрэе і выкліча ў прыродзе ўзноў жыцьцё, узноў радасьць і весяльле. Пасьля восені і зімы, пасьля свайго роду цярпеньня і сьмерці прыроды, прыходзіць вясна, пры ходзіць ускрашэньне.

Усякія вялікія справы чалавецтва, справы зьвязаныя з яго жыцьцём ня толькі матэрыяльным, але і духовым, так-жа сама праходзяць праз барацьбу, цярпеньні, а нават і праз сьмерць. Каб здабыць навуку, зрабіць якое вучонае і важнае для чалавецтва адкрыцьце, трэба людзям шмат працаваць, шмат трудзіцца.

Каб вызваліць з няволі які народ, або якую паднявольную клясу, трэба ўпорыстай, вытрывалай працы цэлых пакаленьняў, а часта нават трэба для гэтай справы і жыцьця людзкога. Аб гэтым сьведчыць гісторыя вызваленьня народаў, гісторыя грамадзка-палітычных рэвалюцыяў і розных вызвольных войнаў. Як Хрыстос дайшоў да свайго ўскрашэньня праз маральныя і фізычныя цярпеньні, праз Галгофу і расьпяцьце на крыжы, так ускрашэньне ці лепш—зьдзейсьненьне,ажыцьцёўленьне людзкіх вялікіх ідэалаў адбываецца так-жа праз свайго роду Галгофу, праз крыжовае, казаў-бы, расьпяцьце ідэйных людзей.

*

Беларусь, айчына й маці наша, жыла калісь жыцьцём вольным, шчасьлівым, жыцьцём дастойным чалавека і народу. Але пасьля гэтага прышла на яе нядоля, настаў занепад, прышла паншчына—няволя і ўрэшце надышло сьмяротнае расьпяцьце Яе на Галгофе. Расьпята яшчэ й сяньня Беларусь, да крыжа прыбітыя яе рукі і ногі. Аднак... на Галгофе бачым зарніцу новага жыцьця Беларусі, бачым, што Яна бэрдза аджывае, ускрашае да поўнай волі, да сьвятла, да праўды, да шчасьця. І аджыве Яна сапраўды і сапраўды ўваскрэсьне.

Залогам ускрашэньня Беларусі — Хрыстова Ускрашэньне,якое беларускага,як і ўсякага іншага людзкога, ускрашэньня зьяўляецца ня толькі сымболем, падабенствам далёкім, але асновай жыцьцёвай, праўдай непарушнай.

Хрыстос Ускрос! Сьмерцяй сьмерць паканаў, быўшым у гробах жыцьцё дараваў!...

„Русская вѣра" на Беларусі.

Гісторыя народаў выяўляе, што рэлігія вельмі памагала ў разьвіцьці культуры. Пэрыяды рэлігійнага ўздыму заўсяды былі часінай маральнага ўгрунтаваньня народаў, а пэрыяды рэлігійнага занепаду—упадкам маральнасьці і наагул культуры. Словам, рэлігія выплывае з адвечнага і непарушнага права прыроднага, якое ўліта ў сэрца кожнага чалавека, якое наказвае чалавеку рабіць добрае і забараняе рабіць зло.

У старадаўнасьці кожны народ меў сваю асобную рэлігію. Пры помачы такой сваёй рэлігіі кожны народ будаваў сваю ўласную культуру, якая зьлівалася ў скарбніцу агульна-людзкай культуры.

Хрысьціянства не зьяўляецца рэлігіяй аднаго, таго ці іншага народу. Яно абымае ўсе народы і аднолькава добратворчае кожнаму народу. Дзякуючы хрысьціянству многія народы змаглі ўзьйсьці на высокі ровень культуры і цывілізацыі. Хрысьціянства, зрастаючыся з духам народу ў яго нацыянальным жыцьці, праяўляе моцную духовую сілу, пабуджае да творчасьці дабра.

Дзеля гэтага славянскія апосталы сьв. браты Кірыл і Мяфод, пашыраючы хрысьціянства сярод народаў славянскіх, паставілі яго на нацыянальны грунт — прапаведавалі ў роднай мове народу.

Гэтак разумелі і гэтак прапаведвалі першыя апосталы усходняй праваслаўнай царквы ідэю Хрыста сярод народаў славянскіх.

Інакш і зусім наадварот, асабліва ў нас на Беларусі, прававедваюць ідэю Хрыста сучасныя апосталы Праваслаўнай Цэрквы— іерархі і ім падуладны клір.

Варожая Беларускаму народу палітыка, гвалцячы прыродныя правы Беларусаў, на Беларусі нікчэмна пагвалціла і праваслаўную Цэркву, адбіраючы яе ад Беларусаў і ствараючы ў ёй „русскую вѣру" для Беларускага народу, каб пры помачы „русской вѣры" Беларусаў вынарадавіць і перарадзіць на маскалёў.

Гэта быў гвалт ня толькі над безбаронным Беларускім народам, але так-жа і гвалт над хрысьціянствам.

Беларускі народ гэны гвалт з мужствам перажыў, ўсьцяж імкнуўся і імкнецца да поўнага жыцьця народнага, вольнага і незалежнага. Ня пашкодзіў гэны гвалт і хрысьціянству, як такому. Асталося ад гэтага гвалту на Беларусі толькі аружжа аднабокіх наезднікаў—„руссая вѣра" ў Хрыстовай Цэркве.

Як толькі згінуў гэны наезднік і спыніўся яго гвалт на Беларусі, праваслаўныя беларусы пачалі дамагацца справядлівасьці — слова Божага ў роднай і зразумелай мове.

Але, на жаль, голас Беларусаў — гэта голас крычачага ў пустыні. Іерархі праваслаўнай Цэрквы на Беларусі ў адносінах да Беларусаў паказалі сябе вернымі маскоўскаму гвалту над Беларускім народам, астаючыся прапагатарамі „русской вѣры" сярод праваслаўных беларусаў на далей.

Праўда, яшчэ ў 1921 г. Патрыярх Ціхан дазволіў, ці лепш сказаць паясьніў, бо кананіча гэта ніколі не забаранялася—карыстацца ў пропаведзях і багаслужэньні беларускай мовай. Пастановы сьв. Сыноду Праваслаўнай Цэркві ў Польшчы ад 16.VI, 14.XII.1922 г. і 7.IX.1924 г. прапануюць духавенству ужываць беларускую мову ў пропаведзях і пры навучаньні рэлігіі.

Але гэта толькі „добрыя" пажаданьні. А дзе-ж выкананьне гэных дазволаў і пастаноў, дзе выкананьне хрысьціянскай добрай волі, каб направіць крыўду пакрыўджаным? Гэтага Беларусы ня бачаць!

Тут можна пачуць, як тлумачацца іерархі і вышэйшая духоўная ўлада праваслаўнай Цэрквы, што яна ўпарадку, бо дазваляе і прапануе духавенству ўжываць беларускую мову ў душпастырстве сярод беларусаў, звальваючы віну на ніжэйшы клір, або каго іншага. Дык навошта-ж тады іерархі і наагул вышэйшая духоўная ўлада?

На наш пагляд, у першую чаргу ва ўсім тут вінавата іменна вышэйшая духоўная ўлада, а пасьля ніжэйшы клір, сярод якога на Беларусі ня мала ёсьць верных палітычнаму гвалту Масквы і прапагатараў „русской вѣры" на Беларусі.

Словам, ва ўсім тут зьяўляюцца адказнымі прад Богам і Беларускім народам прадусім вышэйшы і ніжэйшы клір. А алказнасьць гэная вялікая, бо ад гэнага палітыканства ня мала шкоды і Царкве і Народу.

Цэрквы на Беларусі што далей — то пусьцейшыя, бо там пануе „русскій дух," там прапаведваецца „русская вѣра." Народ, ня маючы па што йсьці ў цэркву, аддаецца у абоймы прапагандзе бязбожжа, ідзе ў розныродныя сэкты, якія раскладваюць яго душу, і так моральна ўпаўшы гнібее. У выніку моральнага заняпаду шырыцца зладзейства, разбоі, забойствы, распуста і г. д.

Гэта вынікі бясслаўнай спадчыны гвалту над Беларускім народам з боку Масквы, якой так заўзята трымаецца большасьць праваслаўнага вышэйшага і ніжэйшага духавенства на Беларусі. Мы аднак моцна верым, што народ Беларускі ператрывае і гэты рэлігійны заняпад, як пратрываў той гвалт над ім, які зрадзіў і гэты рэлійны ўпадак. Верым так-жа, што Беларусы атрасуцца ад запаленьня „русской вѣры" і збудуюць у сябе сапраўдную Царкву Хрыстову на фундаманце свайго беларускага сэрца, з сваімі беларускімі асаблівасьцямі. Дудар.

З беларускага жыцьця.

Справа абходжаньня навагрудзкай паліцыі з вучнямі і вучаніцамі тамашняй беларускай гімназіі. Даведваемся, што прэзыдыум Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні ў мінулым тыдні (7.IV.) перадаў судова-пракурорскім уладам Віленскага Апэляцыйнага Суду цэлую справу аб спосабах дахаджэньня, практыкаваных навагрудзкай паліцыяй у адносіньні да заарыштаваных вучняў (-іцаў) беларускай гімназіі ў Навагрудку. Вінаватых не павінна мінуць заслужаная кара.

Ад Адміністрацыі. Наступны нумар «Бел. Крыніцы», з прычыны Вялікадных сьвяткоў, выйдзе з датай 30 г. м.

Украінцы аб Беларусох.

У прошлым нумары „Бел. Крыніцы" (№ 15) мы падалі водгук нашага сьвяткаваньня 15-ых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі і 70-ых угодкаў беларускай прэсы ў прэсе літоўскай. Сягоньня спаўняем мілы абавязак рээстрацыі вельмі прыгарача водклiку аб нашым падвойным юбілею і прэсы ўкраінскай. Далёкая адлегласьць ад цэнтру сучаснага украінскага жыцьця ў Польшчы (Львоў) і цесныя рамы нашай газэты не пазваляюць нам абняць усіх выступленьняў украінскіх. Робім дзеля гэтага, што у нашай магчымасьці.

Першым адклікнуўся штодзеньнік украінскі „Діло", падаючы на пярэдадні сьвята шырокае апісаньне істоты сьвяткаваных юбілеяў, як 15-ых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі, так і 70-ых угодкаў беларускай прэсы. Пару дзён спусьціўшы тое-ж „Діло" зьмясьціла глыбока адчутую імпрэсію аб Беларусі — «белай сястры» і ўрэшце дэтальнае апісаньне самога сьвяткаваньня, ад пачатку да канца.

Вельмі горача зазначыў нашы беларускія юбілеі афіцыоз Украінскага Нацыянальна-Дэмакратычнага Аб'еднаньня (У.Н.Д.О.) „Свобода", якая, зьмяшчаючы ў № 14 перадавую стацьцю пад назовам „Беларусы", піша зараз-жа на пачатку:

„Гэта нашы таварышы нядолі. Гэта нашы браты. Гэта нашы саюзьнікі на супольным шляху да аднолькавай мэты. Дзяржавы пераможніцы з вялікай вайны аднолькава затрымалі перад намі вялікі кліч самаазначэньня народаў з усімі дальшымі насьледкамі гэтага факту... Нічога, што волю беларускага народу няпрызнана, што завалена цяжкімі калодамі ягоны шлях да вызваленьня, што адабрана яму ўсякую магчымасьць нават культурнага розьвітку, што шмат беларусоў упала, або зьняверылася ў барацьбе. Няўпынная сіла пхае гэты народ наперад і зьбліжае яго да мэты. Сярод труднасьцяў, якія толькі можна сабе ўявіць у паваеннай страшнай сапраўднасьці... гэты народ гарыць любоўю да свайго роднага і крок за крокам, паволі, але самапэўна йдзе па сваім вызвольным шляху".

Апісваючы далей само сьвяткаваньне, дзе

„адназгодна выступіў і гаручы энтузіязм ды глыбокі ідэалізм беларускай моладзі і гістарычна-навуковы і практычны досьлед старшага дзейнага беларускага грамадзянства",

„Свобода" канчае:

„У сваім прывітаньні наш старшыня (Д-р Д. Левіцкі — Р. С.) запэўніў нашых братоў, што украінцы ніколі не пакінуць беларусаў у іхных нацыянальных змаганьнях. І не пакінем. Горкая доля нас разам зьвязала і разам яе пазбудземся».

Важкія гэта словы! Тым больш, што паходзяць з вуснаў старшыні нацыянальнай рэпрэзэнтацыі і пацьвярджаюцца на бачынах афіцыяльнага органу гэтае-ж рэпрэзэнтацыі.

Адклікнулася на наша сьвяткаваньне і тая часьць украінскага грамадзянства, што згуртавана пад сьцягам Украінскай Радыкальнай Партыі. Зацемку аб сьвяце нашым прынасіць часопісь „Громадський Голос", № 14.

Вось з большага перагляд таго, што адбілася аб нашым сьвяце ў люстры братняй украінскай прэсы. Калі дадаць да гэтага асабістае ўчасьце прадстаўнікоў Украіны на нашым сьвяце ў асобах: паслоў Д-р. Д. Левіцкага, Д-р Загайкевіча і пасла Вахнюка, а так-жа прадстаўніка украінскай прэсы ў асобе рэдактара «Діла» грам. Кедрына і прадстаўнікоў украінскага студэнства, дык сапраўды можам сказаць, што мы не адны, мы маем добрых і шчырых суседзяў. Будучыня наша залежа ад нашага-ж цеснага супрацоўніцтва. Р. С.

З Польшчы.

Зьмяншэньне ўраджаю ў Польшчы. Паводле ўрадавай статыстыкі ўраджайнасьць у Польшчы за апошнія гады прадстаўляецца гэтак.

Ураджай жыта: у 1929 г. — 70 мільёнаў цэнтн., у 1930—69 мільёнаў 600 тысяч цэнтн., у 1931 — 57 мільёнаў цэнтн., у 1932—52 міл. цэнтн.

Ураджай пшаніцы: у 1929—17 мільёнаў 900 тысяч цэнтн., у 1930—22 мільёны 400 тысяч цэнтн., у 1931 — 22 мільёны 600 тысяч цэнтн., у 1932 — 14 мільёнаў цэнтн.

Ураджай ячменю: у 1929 г. — 16 мільёнаў 600 тысяч цэнтн., у 1930 — 14 мільёнаў 600 тысяч цэнтн., у 1931 — 14 мільёнаў 800 тысяч цэнтн., у 1932 — 14 мільёнаў 500 тысяч цэнтн.

З гэнай статыстыкі бачым, што ўраджайнасьць у Польшчы зьмяншаецца. Гэнае зьмяншэньне ўраджайнасьці некаторыя тлумачаць упадкам земляробскай культуры.

Касуюць залеглыя падаткі. Міністэрства Скарбу выдала распараджэньне, што Ізбы Скарбовыя могуць касаваць і дароўваюць залеглыя падаткі, каторыя трэба было зыскаць да 31 кастрычніка 1931 г.

Іван Керніцкі.

Вялікадны цуд.

(З украінскай на беларускую мову тлумачыла Г. Ш.).

Раскажу вам адну сьмешную гісторыю, што здарылася якраз у дзень сьвятога Ускрашэньня. Нібы ня ў дзень, але яшчэ прад сьвітаньнем. Ня ручаюся за тое, ці яна слова ў слова праўдзівая, бо я яе на ўласныя вочы ня бачыў. Было гэта трыццаць гадоў таму, калі ня болей, значыць тады я йшчэ ня думаў і на сьвет выбірацца. Гісторыю гэту чуў я ад другіх, а вы, калі ласка, будзьце трэцімі ды яе цярпліва выслухайце.

Жыў у нас каліс адзін чалавечак, Гарасім Пакрышка называўся. Мужчына быў рухлівы, ня дурны, але і не занадта разумны. Як яму часам прыдзецца. Нярaз бывала, што цэлы год трымаецца як трэба: ўзімку малоце, вясной сее, ўлетку жне, вушамі слухае, а носам нюхае, уначы сьпіць, а ў дзень Бога хваліць, і робіць з толкам, і гавора з сэнсам—адным словам, чалавек як мае быць. Але часам прыходзіў такі мамэнт, што наш Гарасім ставаўся быццам ня тым. З спакойнага разважнага гаспадара, рабіўся нейкім дзіваком, ні то дурнаваты, ні то падстрэлены, ніто абмарочаны, ніто бязглузды. Заўсёды нешта прыстрое, што ні прышыць, ні прылатаць. Праўду кажучы, то ён нічога страшнага не рабіў, бо ані вёскі не падпаліў, ані з маста ў ваду ня скочыў, ані вачэй нікому ня выдзер. На гэтулькі йшчэ, мабыць, было ў яго розуму. Але ўсё такі, як ужо прыйшла на яго „манколія", (мэлянхолія — *тлум.*), то ён у кожную хвілю мог уцяць такую штуку, якой-бы ніхто і не спадзяваўся.

Гарасім Пакрышка умеў трохі ткаць. Нібы ня трохі, але тыкі добра стукаў за краснамі. Але праз гэну „манколію" баяліся людзі да яго нясьці. Бывала так, што прынясе гаспадыня пражу: ці то зрэбніну, ці кужаль, а разам з пражай возьме ў якім чарапочку і подмазку. Тагды наш майстра штось сабе разьмяркуе — подмазку выпе, закусіць хлебам, а натканае цапу-лапу пад паху і да жыда.

У жыда набярэ сабе з паўфунта махоркі, варочаецца да хаты, сядае на лаўку пад вакном, закурыць люльку і на столь пускае дымок. Нярaз так прасядзіць і тыдзень, і два... Тады ён нічога ня чуе, нічога ня знае, нічога не абходзіць. Ці прасі, ці малі, ці з гарматы на яго страляй—ён сядзіць ды маўчыць, як глухі пень.

У такіх хвілінах, калі яму прыходзіла, дык сьмяртэльна любіў курыць. Як ня меў пры сабе махоркі, дык проста вар'яцеў! Звычайна тады жонка перад ім усё замыкала, грашэй ён ніколі ня бачыў, а чужая пража таксама рэдка здаралася — вось-жа трэба было радзіць сабе іншым спосабам.

Аднойчы наш Гарасім „парадзіў" сабе так, што прадаў на сенажаці нейкаму прыблуканаму мазуру цэлы стог сена. Узяў пяць карон*) задатку, за тры дні іх пракурыў і „добра"! Аж пасьля аказалася, што Гарасім трошкі памыліўся, бо прадаў мазуру стог сена свайго суседа... Іншым разам налавіў ён гдзесь на балоце мяшок буслаў, прыцягнуў іх уночы да аднэй старой жыдоўкі і прагандляваў, кажучы, што гэта гусі.

Раз неяк, на вясну, пазычыў ён сабе ў свайго дзядзькі каня і пайшоў аборываць бульбу. Паараў так да паўдня, а пасьля выпраг, сеў на каня і гайда проста да блізкага мястэчка. Да хаты вярнуўся аж пад вечар — але ужо пехатой. Свой панадворак мінуў, быццам яго й ня бачыў, а папхнуўся проста да дзядзькі. Але ў хату не заходзіў, толькі прымасьціўся на прызьбе, закурыў сабе люлячку і так сядзеў. Зямлю якраз агортвала ціхая вясьняная ноч. Малочным цьветам цьвілі разложыстыя йгрушы, гучалі жукі над галавою, а па шырокіх сенажацях сьцяліліся белыя вячэрнія туманы. Наш Гарасім загледзіўся на зорнае неба і памаленьку задрамаў. Люлька яму ў роце згасла, а па белым лагодным твары блукалася праз сон нейкая немая, радасная ўсьмешка.

Разбудзіў яго стары, сівы як галуб, але яшчэ крэпкі і злосны дзядзька, з пугаём у руцэ:

— Гарасім, сьпіш?

— Не, драмаю.

— Аборывалася добра?

— Добра.

— Кабылкі ты мне не замучыў?

— Не.

— Закінуў ты ей там сена ў жлоб?

— Не.

— Чаму?

— Я, дзядзька, вашу кабылку прадаў рыжаму Іцку.

*) Карона—назоў грашавой адзінкі у прадваеннай Аўстрыі — тлум.

Паводле гэнага распараджэньня Ізба Скарбовая можа даравадь падаткі: ад абароту да 10000 зл., ад даходу да 5.000 зл. ад маемасьці да 10.000 зл., ад кватэр да 500 зл. і гэтак далей.

У гэтым жа распараджэньні выясьняецца, што можна дароўваць залеглыя падаткі тым плацельшчыкам, ад якіх няма ніякай надзеі гэтыя падаткі ўзыскаць, або калі зысківаючы іх сілай можна давясьці плацельшчыка да ўпадку.

Чуткі аб пазычцы. Польскія газэты падаюць, што ў Варшаве ходзяць чуткі аб тым, што Польшчы ўдаецца дастаць пазычку 50 мільёнаў даляраў. А грошы патрэбныя.

З заграніцы.

Рэформа ўстрою Нямеччыны. На прапазыцыю канцлера Гітлера прэзыдэнт Гіндэнбург назначыў краёвых камісараў, якія маюць дбаць аб утрыманьні аднолькавага кірунку дзяржаўнай палітыкі ўва ўсёй Нямеччыне.

Гаспадарчы байкот гітлераўскай Нямеччыны. Рэзкая лінія народнай рэвалюцыі, якая праводзіцца цяпер у Нямеччыне, змабілізавала проціў сябе прадусім увесь жыдоўскі сьвет і бацькаўшчыну камунізму—СССР. Бальшавікі крута павярнулі свае „сымпатыі" ад Нямеччыны ў бок Францыі і Польшчы, а жыды сьціроўвуюць свае заказы, што дагэтуль ішлі ў Нямеччыну,—у іншыя дзяржавы. Розныя прадстаўнікі нямецкіх фірмаў у Польшчы, Францыі, Галяндыі, Бэльгіі і ў інш. дзяржавах адмаўляюцца ад прадстаўніцкіх прывілеяў. Ня выключана, што жыды спрычыніліся і да ўпадку заграніцай нямецкай валюты.

Трэба зазначыць, што міжнародныя гаспадарчыя кругі з вялікім неспакоем сьледзяць за падзеямі ў Нямеччыне. Яны баяцца, што гэтыя падзеі могуць некарысна адбіцца на міжнародных забавязаньнях Нямеччыны.

Сусьветнае безрабоцьце далей узрастае. Тэрмомэтр гаспадарчай конъюнктуры ўсё ападае, а разам з гэтым узрастае і безрабоцьце. Міжнароднае Бюро Працы абвесьціла цяпер статыстыку за першыя 2 месяцы с. г. і сьцьвярджае няспынны ўзрост безрабоцьця. У цыфрах яно выглядае гэтак: Нямеччына — 6 мільёнаў, Аўстрыя — 401.320, В. Брытанія — 2.914.914, Францыя—368.929, Італія—1.222.470, Японія—503.958, Польшча—266.601, Чэхаславаччына—918.334, Амэрыканская Фэдэрацыя Працы падала у студзені—12 мільёнаў безработных, а „Асоціяція Працы" — каля 17 мільёнаў.

Да нас пішуць.

Аб жыцьці нашай моладзі.

(в. В. Бухаўшчына Нясьвіскага пав.)

Моладзь вёскі Вялікая Бухаўшчына хоць арганізацыі ніякай сваей ня мае, аднак ад моладзі суседніх вёсак на адраджэнскай беларускай ніве працуе шмат балей. Калі здарыцца якая вечарына-спэктакль, ці хоць так якая музыка, дык наша моладзь ня стыдаецца (як гэта бывае ў в. в. Лані і Іванава) гутарыць сваей беларускай мове.

У канцы 1929 г., дзякуючы стараньням І. Мартышэнка і І. Цара, бацькі дзяцей зламжылі дэклярацыі, каб у вёсцы В. Бухаўшчына адчыніць беларускую школу, але як ужо пісалася раней у „Б. К.", усё-ж такі школы не адчынілі.--Моладзь В. Бухаўшчыны час-ад-часу ладзіць беларускія прадстаўленьні. Апошнія два гэткія прадстаўленьні адбыліся ў пачатку 1932 г.: першае 14.II.32, а другое—13.III. 32 г. Мелася адбыцца вечарына яшчэ адна, але дзякуючы арыштам не адбылася. На гэты раз хацелі адыграць напісаную Мікалаем Букатам з в. Гарбунаўшчыны п'есу пад назовам „Шчасьце тваё цябе ня міне." П'еса гэта ў 1930 годзе была працэнзурована ў Нясьвіжы і прызнана, што да пастаноўкі надаецца. А ў гэтым годзе была яна адыграна ў в. Гарбуноўшчыне з учасьцем самога маладога аўтора, які выканаў адну з галаўнейшых роляў. Прайшло шмат часу ад апошняе вечарыны. Але вось 26.II.33 (на запусты) моладзь в. В. Бухаўшчыны, пры помачы двух братоў Букатаў і аднае дзяўчыны з хвальварку Воўкаўшчыны п. Жалнеркевіч, адыгралі спэктакль-веч. у вышэй названым хвальварку. Гэты раз адыгралі драматычную 3-х актоўку „Сурдут і сярмяга." Гутоўскага. Глядзельнікі за кожным актам заглушвалі ўсю залю гукам воплескаў. Словам, уражаньне з вечарыны было надта добрае і пажадана, каб такія вечарыны на вёсках адбываліся як найчасьцей. Адно шкода, што нашая вёска ня мае свае арганізацыі. А варта было-б, каб залажылі гуртюк Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, або Таварыства Беларускай Школы, бо калі прыдзецца зладзіць якую вечарыну, дык прыватна немагчыма дастаць дазволу.

Дык ў добры час!

Зорка.

Гаспадарчая нарада дзяржаў. Прэзыдэнт Зл. Штатаў Амэрыкі Рузвэльт запрасіў да сябе на гаспадарчую нараду Францыю, Англію і Нямеччыну, каб супольна знайсьці спосаб барацьбы з гаспадарчым крызісам.

„Упадак савецкай улады нямінучы". Ангельскі амбасадар Овэй прыехаўшы з Масквы ў Лёндан расказаў аб палажэньні ў Саветах і між іншым заявіў, што упадак савецкай улады ў Расеі нямінучы. Амбасадар Овэй расказвае—СССР перажывае нябывалы крызіс, насельніцтва пагалоўна галадае, а камуністычныя кіраўнікі страцілі ўжо веру самі ў сябе. Овэй расказвае, што ў народзе паўтараецца легенда, якая кажа: „савецкая ўлада будзе трымацца датуль, пакуль будзе ляжаць труп Леніна ў маўзалеі". А маўзалей, у якім ляжыць мумія Леніна, ўжо закрыты, бо труп разгніўся і няма ніякага ратунку далей яго ўтрымаць ад развалу.

Голад і дэзорганізацыя земляробства ў СССР. Газэты падаюць, што цяпер у Саветах страшны голад. Аб гэтым публічна сьцьвердзяць 1 навочныя сьведкі, выехаўшыя з СССР. Між іншым гэта сьцьвярджае і ангельскі амбасадар у Маскве. У некаторых раёнах сяляне вымiраюць з голаду.

Савецкія газэты падаюць, што ўва многіх раёнах пагалоўна ўсе калектывы не прыгатаваны да пасеву. Земляробскія машыны не ў парадку, коні закормлены ды й сяўбовага насеньня няма.

Англія і СССР. Непаразуменьне між Англіяй і СССР паглыбляецца. Ангельскі парлямэнт выдаў закон, які ўпаважнае ўрад да сарваньня гандлю з СССР.

Юбілей 15-ых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі.

Шальціны, Браслаўскага пав. Мяйсцовы гурток Б.І.Г.іК. маніўся ладзіць сьвяткаваньне 15-ых угодкаў Абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі публічна, з адпаведным рэфэратам, сьпевамі дэклямацыямі. З гэтай мэтай Урад Гуртка ў прадбачыным тэрміне выслаў паведамленьне ў Стараства. Старава афіцыяльнай забароны не прыслала, — але зрабіла гэта ў іншы спосаб. Калі ўжо ўсё было прыгатавана, у апошнім часе (25.III.) прышоў паліцэйскі і агледзіўшы памешканьне (новая, прасторная вясковая хата) заявіў, што „лёкаль не одповяда вымаганым варункам" і дзеля гэтага акадэмію ладзіць забараняецца. Іншага памешканьня шукаць было позна, дый не знайшлося-б у ваколіцы такое, якое „адпавядала-б усім варункам", каб меле свае пажарніцкія прылады, „сікаўкі" і г. д. З гэтай прычыны Сьвяткаваньне змагло адбыцца ў Гуртку--выключна для сяброў гуртка.

— Што?! Як?!

— Так, неяк... Ведаеце, захацелася мне курыць, а я ані граша ня меў пры душы...

Стары, злосны дзед ня даў яму скончыць. Узгарэўся ад страшнай злосьці, закляў, размахнуўся і заехаў Гарасіму пугаём праз лоб. Той ускочыў на ногі, заскрыгатаў зубамі, сьціснуў кулакі — але зараз бясьсільна зводьніў. Пасьля абцёр твар з крыві, засмуціўся і моўчкі папхнуўся з панадворку.

На другі дзень „манколія" прайшла. Гарасім адкупіў дзядзьку кабылу, але ад гэтай пары гневаўся на яго, аж пакуль стары не памёр.

Не адну такую штуку адкалоў Гарасім Пакрышка. Што тады на яго нападала—ліха яго ведае! Людзі казалі, што ён зусім нармальны, што толькі часам прытвараецца варыятам, абы каго ашукаць. Але Гарасім ужо з свайго вонкавага выгляду штось ня вельмі быў падобны на круцяля, ці хітруна. Быў гэта мужчына высокі, як тычка, сухарлявы і павольны. Хадзіў заўсёды быццам задуманы, спусьціўшы галаву. Выраз твару меў пагодны, смуглы, вочы лагодныя, шчырыя і ветлівыя. На вуснах—заўсяды усьмешка. Час-ад-часу запускаў сабе доўгую бараду і тады выглядаў быццам сьвяты Антоні Пячэрскі. Гаварыць многа ня любіў, але калі часам скажа пару слоў, то коратка, разумна і дасьціпна, быццам які адвакат.

Кажуць, што ў адным годзе яго выбралі нават у гмінную раду. Але раз на паседжаньні пан войт нечага так страшна раскрычаўся, што ўсе радныя скорчыліся ў клубкі і дрыжэлі, як асінавыя лісты. Адзін толькі Гарасім ня меў ніякага страху: сядзеў спакойна за сталом і лагодна ўсьміхаўся да злоснага пана начальніка. А калі той стаў штось сьпяваць і да яго, Гарасім ні з таго ні з сяго схапіў чарнільніцу (каламарніцу) і выліў усё чарніла на войтаву лысую галаву... Ад гэнага часу ўжо Гарасіма ніколі ня выбралі радным.

Але найбольш сьмешнай і чудачнай штукай, якую прыстроіў Гарасім, быў якраз гэты вялікадны цуд. Пачаўся ён яшчэ у Вялікую Суботу. Гарасімава жонка — Барбарай звалася — панапякала пірагоў, а яны ёй гэтым разам так-жа добра ўдаліся, як ніколі. Толькі стаі і любуйся! Барбара, як кожная гаспадыня, была з гэтага вельмі задаволена і гордая, і зараз хацела пахваліцца мужу.

— Ідзі-ж у камору, паглядзі на пірагі, ці файныя...

Гарасім падпіразаўся дзягай (сьвяты пост — няма што!), націснуў шапку да плёўся ў камору глядзець на пірагі, ці файныя. Пірагі сапраўды прыгожа выглядалі. Былі жоўтыя, румяныя, кругленькія —аж міла! Прысунуўся Гарасім блізенька да іх, пашчупаў далікатна адну бондачку — мякенькая, ліха яе бяры! Панюхаў другую—пахне, дальбо, пахне! Ну, ну! А то раз!... Падумаў штось наш Гарасім, усьміхнуўся да сябе і да булак, а пасьля выняў з кішані ножык, выцер яго аб порткі і давай „прабаваць" маленькую бондачку... Бо гэта ня штука, што яна зверху прыгожа выглядае, але якая ў сярэдзіне, вось што! Гэта грунт!—Ну і ў сярэдзіне аказалася не найгоршай. Ад бяды можна было вытрымаць. Але з аднэй трудна было распазнаць смак, мусіў пакаштаваць другую...

А там, з Божай помаччу, бяз ніякіх перашкод паехала трэцяя і чацьвертая. Ня дзіва: чалавек сьпасьціўся праз увесь сьвяты пост, а пірагі былі мяккія і сьвежыя так, што самі ў рот лезьлі; вось-жа справы пасуваліся ўперад, як па масьле. Пасуваліся датуль, пакуль на скрыні не асталася адна-адзінюсенькая булачка, вось так, каб не зманіць, ушыркі, як камень ад жарон.

Адсапнуўся наш Гарасім, адпусьціў рамень ужо на першую дзірку і паважна задумаўся, што рабіць з гэтым фантам. Есьці, ці ня есьці?... Яно, як гэта кажуць: „елі-б вочы, але жывот ня хоча", бо чалавек, не мяркуючы, як сьвіньня: цабэрак ён, ды годзе. Але сільная воля ломіць горы, скалы і ўсякія іншыя цьвёрдыя рэчы. Калі чалавек з сільным характарам паставіць сабе ў жыцьці якую адну мэту, то ніякія перашкоды ня спыняць яе зьдзейсьненьню. Таксама й наш Гарасім; ён меў цяпер перад сабою адну вялікую ідэю: спакаваць у свой жывот яшчэ і гэты вялікі пірог, што дражніў яго сваім выглядам. Забраўся да яго з ясна акрэсьленым плянам, бо спачатку роўненька адкроіў ножыкам цэлы вяршок, палажыў яго на бок а пасьля стаў раз-па-разу выкалупываць з сярэдзіны мякіш і спакойна паднасіць яго ў напрамку свайго роту. Па гадзіне такой мурашчынай працы выкалупаў ён такім чынам досьць вялікую праталіну. І зараз прыйшла яму думка, што гэту праталіну мусіць ён нечым запоўніць! Абавязкава! Агляну́ўся кругом па каморы і яго погляд затрымаўся каля дзьвярэй, дзе сядзела ў кошыку квактуха з малымі куранятамі. Прысунуў кошык да сябе,

Дзіўна, чаму Стараства і паліцыя ня выказвае сардэчнай дбаласьці аб „безпенэньстве публічнэм“ у адносінах да польскіх арганізацыяў. Колы „Млодз. Пол.“ — у кожнай плебаніі, „Стшэлец“ мае гміну, коло „Млодз. вейскей“ знаходзіць выгодны прыпынак у вясковых школах. Бел. Народны Дом, зроблены уласнымі рукамі вяскоўцаў — ўлады прызнаюць неадпаведным „зэ взглендув бэзпечэньства“. З гэтых самых „взглендув“ не дазваляюць на прачытаньне публічнага рэфэрату беларускай арганізацыі!... Мы не зайздросьцім гладкай дарозе польскіх колаў на нашай зямлі, але баляць нам на нашай дарозе такія калдобіны.

Наддзьвінец.

Паны калоцяцца—можа на добрае.

Будслаў, Вялейскага пав. Наш войт (польскі вайсковы асаднік) страціў ужо ласку і ў мяйсцовых паноў. Людзі розна гадаюць і ніяк ня могуць дадумацца, чаго гэтыя паны калоцяцца. Адны варожаць, што гэта на нешта добрае, а другія кажуць, што гэта так сабе--ведама папанску, Іншыя ўзноў цьвердзяць, што паны хочуць гэтага войта ськінуць і „выбраць“ з пасярод сябе — свайго пана. Для нас, дык і хто яго ведае, як лепш; ня любім мы паноў „сваіх“, ня хочам і чужых. Дзеля гэтага, як будуць выбары войта, нам сялянам трэба выбіраць сваго чалавека.

Цяперашні войт (асаднік) крыху стаў да нас беларусаў „прыхільнейшы“. Ён кажа, што не працівіцца беларускай культуры, але ня любіць беларускай палітыкі. Але ж і палітыка, таксама справа культурная. Усё роўна, ці пан войт любіць ці ня любіць, а мы мусім рабіць тое, што трэба. Мы мусім ісьці заўсяды сваей дарогай беларускай. А на калатню панскую паглядзім і пасьмяёмся.

В. П.

Сэквэстратары ў вёсцы.

Вёска Гавенавічы, Слонімск. пав, У пачатку красавіка наказана было прыгатаўляць падаткі, а зараз і зьявіўся і сэквэстратар з паліцыяй ды пачаў апісваць хатнія рэчы і скаціну. Сэквэстратар пільнаваўся літары цыркуляра і не разьбіраўся ў агульным палажэньні вёскі, кожнага паасобку. Дзеля гэтага забіралі тое, што апісалі. Некаторыя на гэта з жалем паглядалі, а некаторыя пачалі бараніць сваё дабро. Да гэтакіх храбрых трэба залічыць здарову жанчыну Сьцепаніду Тарасюк, жонку каваля з вёскі Гавенавічы. Яна кінулася ў хлеў, замкнула дзьверы і ня пускала экзэкутараў, каторыя сілаю дасталіся ў хлеў, пачалі адпіхаць яе, адводзіць на бок. Але жанчына не далася так хутка. Што мела сілы — змагалася. Урэшце ўсе дагадаліся, што па аднаму не дадуць рады і зрабілі супольны фронт процiў „апазыцыі“. Жанчыну ўзялі на рукі, пад пахі, за ногі і ўнясьлі ў хату. Крычала яна на ўсё сяло: „людцэ мае, ратуйце!“ Людзі зьбегліся. Экзэкутарам брыдка стала, што адной жанчыне не маглі даць рады. У канцы-канцоў пашлі нічога не чапаўшы ні ў хляве, ні ў хаце, задаволеныя абяцанкаю, што заплаціцца незадоўга.—У грамадзяніна Кучука падчас опісі рэчаў і забіраньня іх так напалохалася гаспадара жонка ляжачая ў полазе, што цяжка захварэла і мусіла адвецаць Слонімскі шпіталь. Кучук мае намер судзіцца аб звароце коштаў лячэньня і стратаў яму прычыненых. Зьяўляецца пытаньне, ці ўлады, накладаючы абавязкі на ўрадаўцаў, не кантралююць іх чыннасьці?..

Т. В.

Беларускі спэктакль у Наваградку.

Наваградак. 2.IV. с. г. быў наладжаны школьным краязнаўчым гуртком беларускай філіі дзярж. гімназіі спэктакль, каторага праграма сваім зьместам была датасавана да характару імпрэзы. Уступнае слова аб значэньні краязнаўчай працы для народу, а асабліва для народу беларускага сказаў Пляскач—вучань гімназіі. Пасьля грам. Сланеўскі прачытаў рэфэрат аб імкненьнях і асягненьнях на ніве краязнаўчай працы праз розныя народы ў гістарычным разьвіцьці, выказваючы мэты і спосабы працы ў гэтым кірунку ў сучаснасьці. Пасьля была адыграна п'еса „На вёсцы“. Заслугоўвуе на ўвагу сьмелая ігра вучняў—актараў, вернае адданьне вясковых настрояў, густоўныя ўборы, дэкорацыя і музычная апрацоўка. Памінаючца тут заганы, каторыя зьяўляюцца вынікам неадпаведных абставін матэрыяльнага характару. На заканчэньне, пад кіраўніцтвам грам. Валынчыка, прасьпявана школьным хорам вязанка беларускіх народных песьняў. Малыя недахопы ўсяго вечару выпаўнілі мілы, пагодны настрой прысутных гасьцей і моладзі.

Обсэрватар.

Зачырыкалі і вераб'і ў веніку.

Сёлетняе сьвяткаваньне ўгодкаў абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі гулкім рэхам разьнеслася па ўсёй Зах. Беларусі і далёка па-за ейныя межы. Аб сьвяткаваньні 15-ых угодкаў Абвешчаньня Беларусі вольнай і незалежнай дзяржавай і аб юбілеі 70-ых угодкаў беларускай прэсы шырока пісалі газэты: украінскія, літоўскія, польскія і іншыя. А пісалі яны аб сьвяткаваньні гэтых юбілеяў толькі беларускім незалежна-арганізаваным грамадзянствам і зусім забыліся, што на беларускім ці беларуска-польскім сьметніку ёсьць і іншага роду людзі, якія так-жа ўважаюць сябе за беларусаў, а некаторыя з іх і дубэльтовай народнасьці: — польска-беларускай ці беларуска-польскай, як і дзе выгадней.

Вось, хоць аж па двух тыднях, даведваемся, што ў дзень вялікага беларускага народнага сьвята і гэтыя людзі сьвяткавалі 25 сакавіка.

Ня шмат гэтых людзей, але ўсё-ж такі людзі.

Сабраліся яны ў крамку Т.Б.А., селі за стол застаўлены выпіўкай і закускай. Пабядавалі, што да іх на баль так мала сабралалася людзей, як бы й ня ведаючы, што сярод іх знаходзіцца такая „важная пэрсона“ як Антоні Луцкевіч. Пахвалілі яго, што ён у іх „ініцыятар і тварэц“ ды папрасілі сказаць адпаведную прамову. Антоні ўстаў і коратка сказаў—„хоць мы і залежныя, але гэта ня значыць, што не дасягнем незалежнасьці“. Далей прамаўлялі Астроўскі і Трэпка, якія з націскам падкрэсьлілі, што іх кумпанія надта важная і не такая як усё беларускае грамадзянства. Пасьля гэтага здорава выпілі, крэпка закусілі і разышліся.

Словам, зачырыкалі і вераб'і ў веніку, а водгук гэтага шуму глухім рэхам адбіўся ў газэціне „Родны Край.“

п—к.

Прыймаецца падпіска на 1933 г. на 1-ую беларускую коопэратыўна-гаспадарчую часопісь

«Самапомач».

„САМАПОМАЧ“ ёсьць першай, а да сягоньня на ўсе зах.-беларускія землі і адзінай беларускай часопісьсю, якая займаецца коопэрацыяй і гаспадаркай.

„САМАПОМАЧ“ знаёміць сваіх чытачоў з сапраўдным абліччам коопэрацыі, з ейнымі здабычамі ў іншых народаў і з магчымасьцямі розьвітку яе на землях беларускіх.

„САМАПОМАЧ“ будзіць народ беларускі да самастойнага гаспадарчага жыцьця, як асновы быту ўсенароднага.

„САМАПОМАЧ“ выходзіць што месяц і каштуе, з перасылкай, на год 3 зл., на паўгоду—1 зл. 75 грош., на тры месяцы — 1 зл. Заграніцу — ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі: VILNIA (Wilno), Połackaja 4—10. — Грошы пасылаць праз „П.К.О.“ на конто выдаўца і рэдактара інж. Клімовіча № 180.485.

кватуху зсадзіў на зямлю, але дзеля таго, што яна за голасна проці гэтага пратэставала, Гарасім асьцярожна скруціў ей галаву і палажыў у куточак, дзе яна й скончыла сваё курачае жыцьцё. Па гэтай опэрацыі Гарасімаву душу агарнуў нейкі глыбока—рэлігійны настрой, бо ён дрыжачым голасам засьпяваў сабе «Благообразный Іосіф.» Заводзячы гэны трапар, ён адначасна браў з кошыка адно курчанё за другім і асьцярожна перакладаў у выкалупаны пірог. Калі ўсіх так перасадзіў, тады з гары шчыльна дапасаваў адкроены вяршок, усьміхнуўся задаволена, пахіліў галаву на грудзі і задрамаў.

Ды ліхая-ж доля хацела, каб у гэты мамэнт прынясло у камору Гарасімаву жонку, Барбару. Яна стала на парозе і аж рукамі ўсплясьнула.

— Гарасім! Ты што тут робіш?

— Драмаю.

— А пірагі дзе?..

— Ды я паеў.

— Царства нябеснае! Ды як?! Гэтулькі пірагоў?У Вялікую Суботу? Непасьвенчаныя?...

— Відзіш, неяк так пайшло...

— Ой—ой, ды ён здурэў, чыста звар'яцеў! Ах ты кальвін, ах ты нехрысьць, ах ты адлюдак! Ды як яно табе палезла ў горла?! Гэй, людзі, забярэце куды ад мяне гэтага варьята, бо я ўжо з ім жыць не магу.

Яна разжалілася не памалу: галасіла, прымаўляла, аж галавой білася ў дзьверы з жалю па такіх прыгожых пірагох. А ўрэшце ей не хапіла цярплівасьці: паскладала свае манаткі, пакінула усё, так, як стаяла, сабралася дый пайшла да сваіх бацькоў.

Гарасім ані трохі не сумаваў па гэтым. Ён, як сядзеў у каморы пры апошнім пірагу, так каля яго й заснуў.

Прачхнуўся прад сьвітаньнем, але ўжо зусім здаровы, як бы нічога ня сталася. Галаву меў ясную, спакойную — толькі з адным жыватом трохі было няясна. Быццам праз сон прыпамінаў сабе стог пірагоў... нейкую кватуху... Барбару, але над гэтым ня было калі думаць. Ён мусіў дагледзіць скаціны, прыбраць у хаце, бо Барбара пакінула яго сіратой на цэлай гаспадарцы. А як зазваніў першы звон на набажэнства, наш Гарасім, высокі, паважны ды задуманы, у новай, беленькай сьвітцы пасунуўся ўжо у царкву. На плячах, у клунку валок ён свой апошні пірог, а ў руках — засьцелены ручніком кошык з усялякім іншым дабром.

З-пад сіняга лесу ўзышло яснае, поўнае, чырвонае сонца і прывітала Вялікі Новы Дзень, развесяліла сьвятую зямлю, азалаціла царкоўныя крыжы і радасныя людзкія твары. Загаманіў ўваскрэсны звон мосяжным сэрцам, грымнуў стрэл тысячных грудзей пранасілася вялікая вестка, што Хрыстос Ускрос! З царквы выйшаў у сьветлых рызах бацюшка і пачалося сьвячэньне пірагоў.

Наш Гарасім стаяў каля самых дзьвярэй. Ён рассьцяліў на мураўцы настольнік, на сярэдзіне палажыў пірог, каля яго — чырвоныя яечкі і ўсё іншае, што Бог даў. Сам выпрастаўся на ўвесь рост, задзёр галаву ўгару й выцягаваў за дзяком на цэлае горла «Хрыстос Ускрос!»

І тады якраз стаўся гэны нячуваны, негаданы Вялікадны цуд...

Бо не пасьпеў сьвяшчэньнік размахнуць крапідлам на Гарасімаву сьвянцонку, як на настольнік ні з сяго, ні з таго павыскаквалі, ня ведама скуль, жывыя, маленькія, жоўценькія кураняткі, так штук з дзесятак.

Старэнькаму сьвяшчэньніку рука з крапідлам замёрла ў паветры. Панамар (званьнік) Рыгор Кадзіла выпусьціў з рук на зямлю вядро з сьвянцонай вадой, а дзяк Даніла Выцягайла затрымаўся на нейкай высокай ноце і аніяк ня мог спусьціцца. За дзяком і ўсяму хрышчонаму сьвету засела ў горле вялікадная песьня. Людзі, вытарашчыўшы вочы, выкрыкывалі адзін перад другім штосьць няяснае і незразумелае, бо ў такім дзіўным выпадку чалавеку трудна ясна і талкова выказацца. Раптам адна бяззубая бабулька перахрысьцілася, падняла рукі ў гару ды пралепятала:

— Цуды! Цуды! Бацюшка пакрапіў Гарасімавы яйкі, а з іх павылазілі жывыя куранятк! Цуд стаўся!

. . . .

Праз цэлае сьвята людзі толькі і гаварылі аб вялікадным цудзе. Гаварылі і сьмяяліся, аж за жываты браліся, бо кожны ўжо ведаў, што гэта новая Гарасімава штука.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шуговіч.